**«ЗБОР ПО́ЛЬСКІХ І РУ́СКІХ ПЕ́СЕНЬ»**, вершаваны рукапісны зборнік 17 ст. Упершыню апублікаваны і апісаны А.Брукнерам у 1911. Складаўся з ананімных польск., 66 бел. і бел.-ўкр. песень некалькімі перапісчыкамі, відаць, у Оршы, прызначаўся для дачкі аршанскага падчашага. Адкрывае зб-к «Вельмі пацешная гісторыя» — польск. пераробка ананімнай франц. навелы. У рукапісе няма тво-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раў на рэліг. тэмы. Магчыма, ён узнік у свецкім асяроддзі. Паводле меркаванняў, складаўся 4 асобамі, хутчэй за ўсё, у Оршы, і прызначаўся для дачкі аршанскага падчашага (у зборніку змешчаны панегірычны акраверш, першыя літары якога ўтвараюць словы «Poczaszanka orszańska»). Відаць, напісаны не раней за 1690. Пра гэта сведчыць песня пад нумарам «22», якая з'яўляецца перапрацоўкай укр. думы прыдворнага караля Яна Сабескага біскупа Шумлянскага (згаданы твор вядомы па рукапісе 1690). Большасць песень носіць лірычны характар і цесна звязаны з бел. фальклорам. У творах праяўляюцца рысы барока, а таксама адчуваюцца ўплывы польск. і ўкр. паэзіі. У песнях прапагандуюцца патрыятызм, вернае каханне, асуджаюцца здрадніцтва, маральныя заганы. Захоўваецца пад нумарам «2337» у б-цы Чартарыйскіх у Кракаве.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова